# НАВУКОВАЕ ЖЫЦЦЁ

## КРУГЛЫ СТОЛ «СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ І НАВАЦЫІ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XIX — ПАЧАТКУ XXI ст.» (Мінск, 26 чэрвеня 2014 г.)

На гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адбылося пасяджэнне навуковага круглага стала «Сучасныя тэндэнцыі і навацыі вывучэння гісторыі Беларусі XIX — пачатку XXI ст.» з нагоды 20-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. У 1994 г. кафедра гісторыі Беларусі, якая працавала як структурная адзінка гістарычнага факультэта з 1958 г., была падзелена на дзве: кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў і кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Варта падкрэсліць, што вывучэнне і выкладанне айчыннай гісторыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце пачалося адразу пасля яго адкрыцця. Сярод першых прафесароў былі і спецыялісты па гісторыі Беларусі. У межах круглага стала абмеркаваны шматлікія пытанні айчыннай гісторыі, якія адлюстравалі шырокую палітру навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры. У дадзеным раздзеле ў скарочаным выглядзе прадстаўлены выступленні, якія прагучалі на круглым стале.

### ТЭЗІСЫ ДАКЛАДАЎ

**Сучасныя тэндэнцыі і навацыі ў вучэбна-метадычнай і навуковай дзейнасці кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ.** — *А. Г. Каханоўскі,* загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ.

За час існавання кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу сфарміраваўся ўнікальны навукова-педагагічны калектыў, які вылучаецца шырокім спектрам прафесійных ведаў і навуковых інтарэсаў. Галоўнымі напрамкамі навуковых даследаванняў выкладчыкаў сталі вывучэнне вопыту разгортвання мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX—XX стст., дзяржаўна-палітычных і этнаканфесійных працэсаў, даследаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў

Беларусі, сацыяльнай гісторыі і інш. На кафедры атрымалі развіццё навуковыя школы, якія бяруць свой пачатак у 1920-х гг. — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў XX ст.» (прафесары П. І. Брыгадзін, М. П. Касцюк, У. К. Коршук, П. І. Зялінскі, І. Ф. Раманоўскі, У. І. Адамушка і інш.), «Сацыяльная гісторыя Беларусі XIX — пачатку XX ст.» (дацэнты А. Г. Каханоўскі, В. С. Макарэвіч, Г. І. Маскевіч, старшы выкладчык А. В. Бурачонак і інш.). Прызнанне атрымалі працы па канфесійнай гісторыі Беларусі дацэнта В. А. Цяпловай, па ваеннай гісторыі і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — дацэнтаў А. М. Лукашэвіча, Г. С. Хадасевіч, А. І. Котава, па пытаннях грамадска-палітычнага развіцця Беларусі — дацэнтаў Л. А. Осіпавай, Л. М. Кулеш і інш. За апошнія гады выкладчыкамі кафедры апублікаваны больш за 20 манаграфій, каля 80 навучальных дапаможнікаў і інш. Кафедра здзяйсняе падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі праз аспірантуру і дактарантуру па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя». Зараз тут рыхтуюць дысертацыі больш за 20 аспірантаў і суіскальнікаў. Толькі за апошні час шэраг выпускнікоў аспірантуры прыйшлі працаваць на кафедру (дацэнты В. С. Макарэвіч, Г. І. Маскевіч, старшыя выкладчыкі А. В. Бурачонак, А. Я. Верамейчык, Н. В. Карповіч, Л. Ю. Казакоў). Акрамя таго, выкладчыкі кафедры штогод праводзяць вялікую працу па экспертызе кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Варта падкрэсліць, што папярэдняя экспертыза пераважнай часткі тых з іх, што абараняюцца ў нашай краіне і датычацца гісторыі Беларусі XIX—XX стст., адбываецца ў сценах кафедры.

Асаблівасцю арганізацыі вучэбна-метадычнай работы на кафедры з’яўляецца тое, што выкладчыкі здзяйсняюць вучэбны працэс практычна на ўсіх факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адказваюць за выкладанне блока дысцыплін, звязаных з гісторыяй Беларусі XIX — пачатку XXI ст., на гістарычным факультэце. Адпаведна навукова-педагагічнаму профілю кафедры ўведзена спецыялізацыя «Гісторыя Беларусі ў XIX—XXI стст.». Кафедра ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па напрамках «Айчынная і ўсеагульная гісторыя», «Гісторыя і паліталогія»; з’яўляецца базавай і выпускаючай для студэнтаў напрамкаў спецыяльнасці «Айчынная і ўсеагульная гісторыя», «Гісторыя і паліталогія». На кафедры шмат увагі надаецца абнаўленню вучэбнага працэсу. За апошнія гады выкладчыкі кафедры распрацавалі шэраг новых вучэбных дысцыплін, якія ўводзяцца ў вучэбныя планы па выбары студэнтаў. У іх ліку і тыя, што ўпершыню рэалізаваны ў нашай краіне — «Сацыяльная гісторыя Беларусі», «Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі», «Этнічная і канфесійная гісторыя Беларусі», «Гісторыя прадпрымальніцтва і банкаўскай справы ў Беларусі» і інш. Шмат увагі надаецца папулярызацыі гісторыі Беларусі праз сродкі масавай інфармацыі. Прафесары і выкладчыкі кафедры выступаюць часта ў якасці экспертаў і кансультантаў праграм беларускага тэлебачання, удзельнічалі ў падрыхтоўцы дакументальных кінастужак «Вялікая вайна», «Беларусь у развіцці» і інш.

На кафедры існуе студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (навуковы кіраўнік — дацэнт В. С. Макарэвіч), дзе працуюць каля 20 студэнтаў і аспірантаў, якія на сваіх пасяджэннях абмяркоўваюць знамянальныя падзеі гісторыі Беларусі, выступаюць з дакладамі на канферэнцыях і круглых сталах, удзельнічаюць у міжнародных навуковых праграмах, абмене вопытам са студэнтамі беларускіх і замежных універсітэтаў.

**Беларусь партизанская.** — *В. К. Коршук*, профессор кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ.

Известно, что в годы Великой Отечественной войны на территории Беларуси широкий размах получило партизанское движение. Партизанская борьба — это особая форма борьбы, которую вели люди, представляющие патриотические силы общества, вели путем самовооружения на добровольных началах. По своим целям, социально-демографическому составу участников и поддерживающего его населению она являлась всенародной. Белорусы защищали себя, свои семьи, свой народ от тотального уничтожения. Избавиться от кошмара оккупации, фашистского геноцида можно было только сражаясь.

Говоря о причинах, вызвавших в Беларуси широкое партизанское движение, следует сказать, что на его развитие влияли беззаконие и произвол оккупантов. Партизанская борьба была и единственным выходом для многих красноармейцев, не сумевших выйти из окружения и оказавшихся на оккупированной гитлеровцами территории. Среди активных участников борьбы были и те, кто не входил в состав партизанских отрядов, но, живя в деревнях, обеспечивал партизан продовольствием, одеждой, вел разведку, помогал выводить из строя шоссейные и железнодорожные коммуникации, нарушать линии связи.

При этом борьба в тылу врага развертывалась в органической связи и тесном взаимодействии с боевыми операциями Красной армии на фронте. Партизаны в большом количестве истребляли живую силу, срывали политические, военно-экономические и другие мероприятия противника, деморализовывали оккупационный аппарат. Не ввязываясь в затяжные бои с противником, действуя часто ночью, они нападали на гарнизоны, организовывали диверсии и засады на дорогах, уничтожали транспортные средства, живую силу. Мешали работе штабов и линии связи, разрушали дороги и мосты, уничтожали склады в небольших гарнизонах, освобождали из лагерей военнопленных, вели разведывательную работу, срывали продовольственные заготовки оккупантов, проводили агитационно-пропагандистскую работу. Особое место принадлежало рейдам партизанских формирований по вражеским тылам, важную роль сыграла «рельсовая война». Неразрывная связь партизан с населением особенно чувствовалась в партизанских зонах, имевших огромное значение для развертывания борьбы с врагом, охране жизни многих людей. Это были территории, освобожденные партизанами от оккупантов, которые удерживались и контролировались парти-

занами. Первая партизанская зона была создана уже осенью 1941 г. К осени 1943 г. партизаны удерживали под своим контролем более 20 зон, что составляло 108 тыс. кв. км — около 60 % оккупированной территории Беларуси, а всего в годы войны было создано 25 партизанских зон. Образование партизанских зон означало полную несостоятельность гитлеровского «нового порядка», беспочвенность надежд фашистской верхушки на «умиротворение» оккупированной территории Беларуси.

Нельзя недооценивать влияния партизанского движения и на ход войны в целом. Гитлеровцы вынуждены были отвлекать с фронта значительные силы для борьбы с партизанами. Сочетая тактику упорной борьбы с умелым маневрированием, неожиданными ответными ударами, партизаны удерживали в своих руках инициативу вплоть до полного освобождения территории республики от оккупантов. В ходе освобождения республики воинские соединения и части Красной армии тесно взаимодействовали с партизанскими формированиями. С помощью партизан отдельные части Красной армии проникали в тыл противника, совершали глубокие обходные маневры и совместными внезапными ударами освобождали населенные пункты, принимали участие в ликвидации окруженных воинских частей. После освобождения Беларуси свыше 180 тыс. партизан влились в Красную армию. А всего на фронтах Великой Отечественной войны сражалось 1 млн 300 тыс. белорусов, внесших значительный вклад в приближение Великой Победы.

**Об изучении курса «История общественных движений и политических партий» на историческом факультете.** — *И. Ф. Романовский,* профессор кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ.

Политические партии и общественные движения являются неотъемлемой частью политической системы современного демократического общества и требуют своего анализа и осмысления. Основная задача курса — формирование у студентов глубоких знаний о политических партиях, их идеологии, программах и деятельности, навыков политической культуры, необходимых для созидательного участия в общественной и политической жизни общества. Данный курс помогает студентам преодолеть сложившийся в советской исторической науке стереотип, когда изучалась история только одной политической партии, ее политика и практические действия. Что касается других партий, действовавших в прошлом в России и Беларуси, то их история искажалась, им давалась негативная оценка. Поэтому объективный анализ прошлого, поиск правильных ответов для будущего — диалектика творческого познания истории общественных движений и политических партий.

Предмет изучения курса — история возникновения, оформления и развития политических партий и движений в России и Беларуси как элемента политической системы общества, которая изучается в хронологической последова-

тельности и охватывает период с начала XIX в. по настоящее время. Такой принцип позволяет проследить процесс политического движения в России и Беларуси, уяснить объективные условия появления политических партий, получить четкое представление об их стратегических и тактических установках в борьбе за осуществление своих политических программ. Студентам же предлагается ознакомиться с документами политических партий и сделать собственные выводы на основе самостоятельного познания.

При освещении истории российских партий, действовавших в прошлом на территории Беларуси, в курсе большое внимание уделяется формированию и деятельности белорусских политических организаций, их отношениям к проблемам национально-государственного строительства.

Курс предусматривает изучение причин установления в СССР однопартийной системы и ее последствий для развития страны. Особое внимание уделяется процессу становления и деятельности современных политических партий и общественных движений в Республике Беларусь.

**Духовная школа на белорусских землях в первой половине XIX в.** — *В. А. Теплова,* доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ.

Новым явлением в развитии образования на белорусских землях стало создание системы духовного образования, предполагавшего формирование начальной, средней и высшей школы. Наиболее подготовленной в осуществлении этой идеи оказалась римско-католическая церковь, имевшая достаточно разветвленную образовательную структуру, сформировавшуюся еще в предыдущее время.

Высшее католическое образование первой трети XIX в. было представлено Главной духовной семинарией при Виленском университете (1808—1831 гг.) с четырехлетним курсом обучения. В 1845 г. она была преобразована в католическую академию и переведена в Петербург. Среднее духовное образование римо-католики могли получить в Могилевской духовной семинарии, созданной в 1788 г.

Униатские духовные школы были представлены новосверженьской (1743—1828 гг.) и лавришевской (1799—1828 гг.) семинариями, находившимися под юрисдикцией базилианского ордена. Особое внимание в них уделялось изучению латинского языка и католической богослужебной традиции. Попытки униатских иерархов создать учебное заведение, предназначенное для обучения белого духовенства, были реализованы в полоцкой (1806—1828 гг.) и жировичской семинариях (1828—1845 гг.). По своей структуре и образовательной программе они были приближены к православной духовной традиции. Однако четко структурированной системы обучения в католической духовной школе создано не было. Из-за отсутствия строгой субординации между училищами и семинариями последние зачастую сочетали в себе низшую, среднюю и даже высшую ступени образования.

Православное духовное образование находилось в стадии формирования. Его центром оставалась Могилевская семинария, действовавшая еще с 1759 г. В 1785—1793 гг. была открыта Минская семинария. С возрождением православной полоцкой епархии в 1833 г. начинает свою деятельность витебская семинария, в 1845 г. — литовская. Согласно уставу 1808 г. начинается организация уездных училищ, которые должны были начать подготовку будущих воспитанников семинарий. Православная духовная школа также не создала законченной образовательной структуры. Задачи организации высшей православной духовной школы на белорусских землях стали задачей будущего.

**Патрыятычнае выхаванне студэнтаў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі.** — *Г. С. Хадасевіч,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ.

Важны імпульс патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі — вывучэнне гісторыі Беларусі. Працэс патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі непарыўна звязаны з вучэбным працэсам. «Патрыятызм — patris — айчына» — маральны і патрыятычны прынцып, сацыяльнае пачуццё, зместам якога з'яўляецца любоў да Айчыны, адданасць ёй, гонар за яе мінулае і сучаснае, імкненне абараніць інтарэсы Радзімы. Бясспрэчна, гэта высокае пачуццё, а тым больш калі пранікнута яно павагай за народы іншых краін і не вырашаецца псіхалогіяй нацыянальнай выключнасці, з'яўляецца тым актыўным ядром, якое натхняе чалавека на гераічны ўчынак, высакародную дзейнасць.

Выхоўваць і фарміраваць гэтыя якасці ў моладзі XXI ст. — першачарговая задача выкладчыка гісторыі Беларусі. Каб гэты працэс не стаў безвыніковым, ён не павінен насіць эпізадычны характар. Зыходзячы з гістарычнага мінулага мы фарміруем у студэнтаў гістарычную свядомасць, гэта важны фактар выхавання патрыятычных пачуццяў. Безумоўна, гэта немагчыма без ведання гістарычнага мінулага і разумення свайго сучаснага народа і яго перамог і паражэнняў, нацыянальных герояў, таленавітых вучоных, а таксама каштоўнасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры. Гістарычная памяць абуджае ў студэнтаў пачуццё ўласнага гонару і адзінства з народам, дапамагае ацаніць месца свайго народа ў айчыннай і сусветнай гісторыі.

Нам зусім неабыякава, якім духоўным каштоўнасцям, якім сацыяльным прыярытэтам моладзь аддае перавагу, на якія ідэалы яна апіраецца. Наша задача дапамагчы студэнтам правільна сфармуляваць светапогляд у кіпучым кругавароце гістарычных падзей.

**Белорусские земли в военно-стратегических планах Российской империи (1772—1914): перспективы изучения проблемы.** — *А. М. Лукашевич*, доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ.

Одним из малоизученных аспектов отечественной истории остается проблема роли и места белорусских земель в военно-стратегических планах соседних го-

сударств. Реализация геополитических задач различных государств в отношении Беларуси может рассматриваться через планирование военных действий на западном направлении, всестороннее изучение и подготовку белорусских земель как вероятного театра военных действий, оценку политической ситуации структурами разведки, контрразведки и сыска. Поскольку военно-стратегическое планирование также включает использование ресурсов территорий (людских, финансовых, провиантских) и организацию системы управления войсками, целесообразно отдельно изучить и эти аспекты проблемы.

Основной комплекс документов, раскрывающих различные аспекты военно-стратегического планирования, хранится преимущественно в российских архивах, и прежде всего в Российском государственном военно-историческом архиве (Москва).

Методологические подходы к исследованию проблемы, заложенные в докторской диссертации А. М. Лукашевича «Белорусские земли в военно-стратегических планах Российской империи (конец XVIII в. — 1812 г.)», защищенной в 2014 г., могут быть использованы при проведении сравнительных исследований по военной истории различных эпох. Например, при изучении военных событий 1812 г. и Первой мировой войны, 1812 г. и начального этапа Великой Отечественной войны, Первой мировой и Великой Отечественной войн. Все это позволит вывести исторические уроки, которые целесообразно учитывать в ходе современного государственного и военного строительства, избежать стратегических просчетов и ошибок, допущенных в прошлом

При этом в изучении «эпохи 1812 г.» по-прежнему перспективными остаются такие проблемы белорусской истории, как эволюция этноконфессиональной и социальной структуры общества в конце XVIII в. — 1812 г.; планирование и использование финансовых, материальных и людских ресурсов в военных планах противоборствующих сторон; социальное и этноконфессиональное противостояние в 1812 г.

**Удзел студэнтаў і выкладчыкаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Вялікай Айчыннай вайне.** — *А. І. Котаў*, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ.

Гады Вялікай Айчыннай вайны для Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і яго гістарычнага факультэта былі часам высокага ратнага подзвігу і самаадданай працы, прасякнутых патрыятычным пад'ёмам. Нямала слаўных ратных і працоўных здзяйсненняў на рахунку калектыву гістарычнага факультэта. Сотні яго выхаванцаў і супрацоўнікаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, а двое — М. П. Катлавец і Д. П. Жмуроўскі — удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

У дні суровых выпрабаванняў студэнты і выкладчыкі факультэта, як сведчаць дакументы, пачэрпнутыя намі з дзяржаўных архіваў, апублікаваных матэ-

рыялаў і ўспамінаў непасрэдных удзельнікаў вайны, усведамлялі асабістую адказнасць за лёс сваёй радзімы. Ужо ў першыя дні вайны, не чакаючы павестак, яны ішлі ў ваенкаматы, каб запісацца ў дзеючую армію.

Аднымі з першых, уступіўшых у дзеючую армію ў ліку 450 студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, былі дацэнт Іосіф Лочмель, выпускнік Іван Рыбакоў, аспірант Рыгор Трухноў, студэнты Леанід Сокал і Аляксандр Фердэр. Лочмель, Рыбакоў, Сокал і Фердэр геройскі загінулі ў першых цяжкіх абарончых баях. Выкладчыкі і студэнты гістфака (даваеннага і пасляваеннага часу) мужна змагаліся за Мінск і Магілёў, Смаленск і Маскву. У гісторыю Сталінградскай бітвы, пасля якой стратэгічная ініцыятыва перайшла да Савецкіх Узброеных Сіл, упісаны імёны многіх выхаванцаў БДУ, у ліку якіх Пётр Захаравіч Савачкін. Пасля вайны ён працаваў выкладчыкам, а ў 1956—1973 гг. — дэкан гістфака.

За ўдзел у Курскай бітве, у баях за Украіну і Беларусь, за вызваленне народаў Еўропы ад фашысцкай тыраніі, мужнасць і адвагу былі ўзнагароджаны многія нашы студэнты і выкладчыкі. Сярод іх — К. К. Герман, С. Г. Скапцоў, І. В. Марчанка, М. В. Прылепка, А. І. Сідарэнка, Г. Г. Герасіменка, А. С. Сцепаненка, І. В. Міронаў, А. С. Фядосік.

У складзе Савецкіх Узброеных Сіл, якія грамілі японскую Квантунскую армію, вызвалялі паўднёвую частку Сахаліна, Паўночна-Усходні Кітай, былі студэнты гістфака, будучыя дактары навук Л. С. Абецэдарскі і В. У. Чапко.

Студэнты і выкладчыкі факультэта актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе з агрэсарам у тыле германскіх войскаў. Яркая старонка ў летапісе гэтай барацьбы — Мінскае падполле. Адным з першых у падпольную арганізацыю І. Х. Маркава (Пагодзіна) увайшоў выпускнік гістфака, вучоны сакратар Інстытута гісторыі АН БССР Мікалай Махнач. Уладкаваўшыся на біржу працы, ён забяспечваў дакументамі і накіроўваў на працу патрэбных Мінскаму падпольнаму гаркаму партыі людзей. Асаблівая ўвага ўдзялялася Мінскаму чыгуначнаму вузлу. Групе Маркава (Пагодзіна), у якую ўваходзілі М. Махнач і студэнтка Зінаіда Андрыянава, удалося завербаваць шэфа канцылярыі імперскай (германскай) чыгуначнай дарогі «Мінск» Ганса Штраўбе і мець дакладныя звесткі аб перамяшчэнні жывой сілы, тэхнікі і боепрыпасаў ворага на гэтай важнай транспартнай артэрыі. Інфармацыя рэгулярна дастаўлялася Мінскім падпольным гаркамам партыі ў БШПД і разведорганы Чырвонай арміі да чэрвеня 1944 г., калі былі арыштаваны і закатаваны гітлераўцамі Штраўбе, Махнач і Андрыянава.

У падпольную арганізацыю «Андруша» (кіраўнік Мікалай Кедышка) уваходзіў студэнт Віктар Міхневіч. Ён пазней арганізаваў групу «Віктар», якая актыўна дзейнічала на заводзе імя Варашылава. Маладзёжнае падполле Мінска з 1942 г. узначальваў першы сакратар Мінскага падпольнага гаркама ЛКСМБ Мікалай Нікалаеў. Студэнт Вадзім Пазняк у гады вайны стаў адным з арганізатараў і кіраўнікоў маладзёжнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці.

З 1941 г. у барацьбу супраць акупантаў уключыўся 15-гадовы юнак Аляксандр Царук. Пасля вайны ён скончыў на выдатна гістфак, працаваў выкладчыкам, дацэнтам, намеснікам дэкана завочнага факультэта БДУ.

Студэнты і выкладчыкі факультэта самааддана працавалі ў савецкім тыле, пасля эвакуацыі ва ўсходнія раёны Савецкага Саюза. Яны выкладалі ў ВНУ, тэхнікумах і школах, працавалі на заводах і фабрыках, у калгасах і саўгасах. Педагагічнай і навукова-даследчай работай займаліся акадэмікі У. М. Перцаў і М. М. Нікольскі, прафесары Г. А. Воранава і А. П. П'янкоў, дацэнты Ф. М. Нечай, Г. М. Ліўшыц, Л. М. Шнеерсон, выкладчыкі М. П. Баранава, М. Б. Фрыдман. Навуковыя працы нашых грамадазнаўцаў, іх вусныя публічныя выступленні заклікалі людзей на барацьбу за вызваленне сваёй краіны і служылі справе Вялікай Перамогі.

Адзначаючы 70-годдзе Вялікай Перамогі, мы ўсведамляем, што чым далей ад нас гады вайны, тым ярчэй праяўляецца гераічны подзвіг тых, хто адстаяў свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

**Высшие территориальные комитеты государственного аппарата Российской империи по управлению территорией Беларуси в XIX в.** — *О. В. Лепеш*, доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ.

Характерными чертами государственного аппарата России XIX в. были стабильность министерской системы и усиливавшееся стремление к созданию отдельных территориальных комитетов по управлению окраинами Российской империи. История знает около десятка подобных комитетов (Первый и Второй Сибирские, Комитет по делам Царства Польского, Кавказский комитет). Для управления западными, в том числе белорусскими губерниями, в XIX в. были созданы сначала Комитет западных губерний (1831—1848 гг.), а затем Западный комитет (1862—1865 гг.). Территориальные комитеты были призваны ликвидировать отстраненность Кавказа, Сибири, Беларуси, Литвы, Правобережной Украины, Польши от внутренних губерний России и установить там тот же порядок, какой существовал в центре.

Основные вопросы, рассматриваемые в Комитете западных губерний (1831—1848 гг.), связаны с сословной политикой, с проблемами введения на территории Западного края российского законодательства и формирования единого правового пространства, с реорганизацией системы образования и урегулированием конфессиональной жизни. Западный комитет (1862—1865 гг.) рассматривал комплекс мер по ликвидации последствий восстания 1863 г.: учреждение военно-полицейского управления в Северо-Западном крае, наложение секвестра на имения польских помещиков, оставшихся за границей и продолжающих свою революционную деятельность. Также члены Западного комитета старались укрепить местный административный аппарат выходцами из внутренних губерний России и искоренить в системе образования польский язык.

Оба Комитета призваны были устранить последствия шляхетских восстаний 1830—1831 и 1863—1864 гг. и разработать программу по полному слиянию западных губерний с внутренними губерниями России.

**Станаўленне і развіццё патэнтнага заканадаўства на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.** — *А. В. Бурачонак,* старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ.

У XIX ст. усё больш з'яўлялася людзей, якія сваімі вынаходствамі давалі новае жыццё некаторым галінам вытворчасці. Дзяржава павінна была гарантаваць такім асобам права карыстання іх адкрыццём, зарэгістраваўшы прывілею, якая замацоўвала выключнае права карыстання вынаходніцтвамі ці тэхнічнымі ўдасканаленнямі. Заканадаўчая аснова развіцця інстытутаў выключных правоў на аб'екты прамысловай уласнасці закладзена яшчэ ў першай палове XIX ст. з прыняццем 17 чэрвеня 1812 г. і 22 лістапада 1833 г. адпаведных Маніфеста і Палажэння. Згодна з прававымі нормамі прывілея з'яўлялася актам, які быў выдадзены асобе ўрадам. Дадзены акт даваў пэўнай асобе права карыстання вынаходніцтвам ці ўдасканаленнем як сваёй уласнасцю на працягу 10 гадоў.

10 снежня 1830 г. пінскаму павятоваму прадвадзіцелю дваранства А. Скірмунту была выдадзена прывілея на снарад для выпарвання цукровых раствораў з дапамогай пары на плоскай і пакатаўсталяванай паверхні. Дзякуючы адкрыццю, такі ж аб'ём цукру можна было атрымаць за 3—4 хвіліны замест ранейшых 4—5 гадзін. Аднак А. Скірмунт не першы выхадзец з беларускіх губерняў (калі не абмяжоўвацца 35 беларускімі паветамі), хто атрымаў прывілею на вынаходніцтва. Першым быў жыхар Віленскай губерні Г. Маркевіч, які прыдумаў машыну для вырабу цэглы, дахоўкі і іншай прадукцыі з гліны, за што 17 сакавіка 1828 г. атрымаў адпаведны дакумент.

Змены ў заканадаўстве, якое забяспечвала абарону інтэлектуальнай дзейнасці, былі ўнесены толькі ў канцы XIX ст. У адпаведнасці з прынятым 20 мая 1896 г. Палажэннем прывілеі маглі выдавацца як рускім, так і замежным падданым, і не толькі ўласна вынаходцу, але і яго правапераемнікам. Дазвалялася яе перадача іншай асобе, але аб гэтым неабходна было паведаміць у Дэпартамент гандлю і мануфактур. Такім чынам, улады імкнуліся стымуляваць прымяненне тэхнічных наваўвядзенняў у вытворчасці.

**Формирование территории и правовое положение Несвижской ординации в конце XVI — начале XIX в.** — *А. Е. Веремейчик*, старший преподаватель кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ.

Договор об учреждении Несвижской ординации (майората) был подписан в 1586 г. Документ разделил владения Радзивиллов на майоратные (неотчуждаемые земли рода) и аллодиальные (земли, передающиеся по наследству с правом их продажи и дарения). Несвижская ординация стала наследоваться по прави-

